УДЗЕЛЬНІКАМ СІСТЭМЫ БУДЗБЕРАЖЭННЯЎ ДАЗВОЛЯЦЬ НАБЫВАЦЬ ЖЫЛЛЁ ПА САЦЫЯЛЬНЫХ РАСЦЭНКАХ?

ЗА мінулы год у Беларусі было здадзена ў эксплуатацыю 6 млн 700 тысяч квадратных метраў жылля, што адпавядае 96,3 працэнта ад гадавога плана. Начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ адзначыў учора журналістам, што гадавы план па будаўніцтве жылля ў поўнай меры выканалі Брэсцкая, Гомельская і Мінская вобласці.



Летась аб'ём інвестыцый у асноўны капітал на будаўніцтва жылля склаў каля 12 трл рублёў. Доля сродкаў насельніцтва ў гэтым аб'ёме адпавядае 35,1 працэнта, крэдыты банкаў — 53,7 працэнта. Спецыяліст паведаміў, што летась у краіне было пабудавана 952 кватэры па лініі сацыяльнага карыстання, што на 22 працэнты больш за план. СТАР. 7

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 СТУДЗЕНЯ 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 17
(26881)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«МЫ ПАВІННЫ БЕРАГЧЫ ЯК ЗРЭНКУ ВОКА НАШ НАРОД»

ПАЛАТА прадстаўнікоў прадэманстравала ўчора зайздросную аднадушнасць, даўшы згоду на прызначэнне Міхаіла МЯСНІКОВІЧА прэм'ер-міністрам. Усе 109 удзельнікаў пасяджэння сёмай пазачарговай сесіі сваім голасам аказалі яму падтрымку. Адказваючы на іх пытанні ў Авальнай зале, М. Мясніковіч расказаў, як будуць развівацца лагістычныя цэнтры і прыдарожны сэрвіс у Беларусі, наколькі маштабная карэкціроўка спатрэбіцца дзейнаму заканадаўству, каб адпавядаць Дырэктыве №4. Паведаміў і пра тое, што праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку будзе разгледжаны новым Урадам першага лютага.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА, прадстаўляючы кандыдатуру М. Мясніковіча, згадаў яго вялікі вопыт эканамічнай, навуковай і кіраўніцкай дзейнасці, адказныя пасады, якія той займаў. І ў час, калі краіна пераходзіць на інавацыйны шлях развіцця, калі нам трэба яшчэ больш паскорана і мэтанакіравана праводзіць мадэрнізацыю, ствараць новую эканоміку, падобныя веды і рознабаковы вопыт асабліва важныя.

Фота БЕЛТА.

— Ён ведае, што такое нана-, бія-, лазерныя, фармакалагічныя, касмічныя і іншыя перадавыя тэхналогіі, зможа вызначыць, якія з гэтых напрамкаў нам лепш развіваць. Гэта важна, бо роля акадэмічнай, галіновай і вузаўскай навукі ў развіцці краіны ў бягучай пяцігодцы ўзрастае, — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што новы прэм'ер-міністр здольны арганізаваць работу не толькі па дасягненні валавых паказчыкаў, але і па забеспячэнні эфектыўнасці эканомікі.

— Я далёкі ад думкі, што ўсё гэта будзе давацца лёгка. Аднак для паспяховага руху наперад закладзена добрая аснова.

Вытворчасць ВУП на душу насельніцтва і ўзровень жыцця беларускага народа да 2016 года павінны наблізіцца да сярэднееўрапейскіх. Прэзідэнт акцэнтаваў, што для выканання намечанага на новую пяцігодку неабходны вялікая дынаміка развіцця краіны, сучасныя падыходы да кіравання эканомікай.

— Для гэтага ва Урадзе патрэбны людзі рашучыя, вопытныя, прагматычныя, якія добра ведаюць праблемы і ідуць ад жыцця. Менавіта такі Савет Міністраў цяпер у асноўным сфарміраваны.

І ён павінен стаць сапраўды калегіяльным органам кіравання.

— Не трэба «вісець» над міністрамі і пастаянна іх панукваць, — кажа кіраўнік дзяржавы. — На цяперашнім этапе трэба пераносіць усю адказнасць за стан эканомікі і сацыяльнай сферы на міністраў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, губернатараў, старшынь райвыканкамаў.

Вось на гэтых узроўнях павінны прымацца ключавыя рашэнні і актывізавацца ініцыятыва. А прэм'ер-міністр павінен найперш кантраляваць выкананне стратэгічных задач, вызначаных праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяцігодку. Яму трэба так выбудаваць работу Урада, каб спрэчкі і дыскусіі мелі месца толькі да моманту прыняцця рашэнняў.

— Далей — безумоўнае выкананне, без лішняй мітусні і разгалгольстваванняў. Патрабаванне выканальніцкай дысцыпліны ніхто не адмяняў, — нагадвае Прэзідэнт.

Пры гэтым Ураду варта цесна ўзаемадзейнічаць з усімі галінамі дзяржаўнай улады, у прыватнасці, з парламентам.

— Трэба больш актыўна працаваць над удасканаленнем заканадаўства з улікам сучасных патрабаванняў лібералізацыі эканомікі, — зазначыў А. Лукашэнка.

Якія ж ключавыя задачы ставяцца перад новым Урадам?

Структурная перабудова эканомікі

— Яна павінна быць накіравана як на карэнную мадэрнізацыю дзейных прадпрыемстваў з мэтай павышэння іх канкурэнтаздольнасці, так і на стварэнне прынцыпова новых вытворчасцяў і сектараў эканомікі, якія выпускаюць экспартаарыентаваную, высокатэхналагічную інавацыйную прадукцыю, — адзначыў дзяржаўны лідар.

Таму да неканкурэнтаздольных, хранічна стратных прадпрыемстваў маюць быць прынятыя радыкальныя захады.

— З імі трэба разбірацца, зыходзячы з набытага вопыту — ад прыватызацыі да ліквідацыі. Патрабаванне тут адно: людзі, супрацоўнікі прадпрыемстваў, якія ліквідуюцца, не павінны быць пакрыўджаны. Па пытаннях працаўладкавання такіх работнікаў Ураду трэба цесна ўзаемадзейнічаць з мясцовымі органамі ўлады.

Кіраўнік краіны слушна задаецца пытаннем: «Калі дзяржаўнае прадпрыемства хранічна стратнае, эканамічна бесперспектыўнае, навошта прадаўжаць аказваць дапамогу, закопваючы ў зямлю фінансавыя рэсурсы?». І рэзюмуе: «Мы павінны падтрымліваць толькі эфектыўныя або асабліва значныя сацыяльныя праекты».

Не купляць больш, чым прадаваць

Сумесна з Нацбанкам новаму Ураду давядзецца заняцца ліквідацыяй дыспрапорцыі ў фінансавай сферы, скарачэннем адмоўнага знешнегандлёвага сальда. Такую задачу паставіў Прэзідэнт.

— Я неаднаразова папярэджваў ранейшы ўрад аб недапушчальнасці такой практыкі, калі на працягу шэрагу гадоў мы закуплялі з-за мяжы больш, чым прадавалі. Калі на $1 экспарту прыпадае $1,2 імпарту, гэта немінуча вядзе да нарастання пазыковага цяжару і, у канчатковым выніку, стварае пэўную пагрозу нашай эканамічнай бяспецы.

А сёлета яшчэ і цэны на энерганосьбіты для Беларусі дасягнуць амаль сусветнага ўзроўню.

— Пры такіх неспрыяльных умовах нам трэба не проста ўтрымаць эканоміку, але і дабіцца значнага прыросту, — заўважае Аляксандр Лукашэнка. — Ураду для гэтага неабходна прыняць вычарпальныя меры па павышэнні энергаэфектыўнасці, максімальна наблізіць паказчыкі энергаёмістасці эканомікі да ўзроўню развітых еўрапейскіх краін.

Тут у нас, паводле яго слоў, маецца сур'ёзнае адставанне, якое трэба ліквідаваць. Ён папярэдзіў, што ніякіх апраўданняў безгаспадарчасці ўзрослымі цэнамі на энергарэсурсы больш не будзе. Асаблівы акцэнт кіраўнік Беларусі зрабіў на ролі эканоміі матэрыяльных рэсурсаў ды імпартазамяшчэння. Там, дзе гэта эканамічна апраўдана і эфектыўна, трэба развіваць айчынную вытворчасць. А новыя магчымасці, якія дае Мытны саюз, — выкарыстоўваць па максімуму. Ён адкрывае рынак у 170 млн патэнцыйных спажыўцоў беларускай прадукцыі, у якой, па вялікім рахунку, няма канкурэнтаў ні ў Мытным саюзе, ні на традыцыйных рынках СНД.

Фота БЕЛТА.

Палегчыць шлях інвестыцыям

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад Урада жыць толькі па сродках і пакласці канец нарошчванню дадатковых пазыковых абавязацельстваў. Аднак беларускі лідар усведамляе, што нам будзе складана ўкараняць тэхніку і тэхналогіі сусветнага ўзроўню ўласнымі сіламі — без прамых замежных інвестыцый крэдытаў на выгадных умовах. Таму трэба сфарміраваць такую сістэму работы з замежнымі інвестарамі, якая максімальна палегчаць іх шлях на наш рынак. Ужо сёлета ўдзельная вага замежных крыніц у інвестыцыях у асноўны капітал павінна скласці не менш за 21 працэнт. Адпаведна выкарыстоўваць прыцягнутыя сродкі варта як мага больш эфектыўна. А да 2014 года неабходна забяспечыць выхад на дадатнае сальда знешняга гандлю. СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У КАНЦЫ КРАСАВІКА ПАЧНЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА САМАЙ БУЙНОЙ БАЛЬНІЦЫ Ў БЕЛАРУСІ

Будаўніцтва гарадской клінічнай бальніцы ў мікрараёне Паўночны з прыцягненнем французскага крэдыту ў 300 млн еўра пачнецца ў канцы красавіка 2011 года. Дагавор на распрацоўку архітэктурнага праекта падпісалі 26 студзеня ў Мінгарвыканкаме прадстаўнікі будаўніча-інвестыцыйнай кампаніі Bjuygues Batiment International (BBI, Францыя) і кіраўніцтва сталіцы.

Кампанія BBI выступіла ў якасці генпраектнай і генпадраднай арганізацыі.

Клініка на 1200 месцаў зойме тэрыторыю плошчай 100 тыс. квадратных метраў. Яна стане самай буйной бальніцай у нашай краіне. «Мы плануем зрабіць яе клінікай інтэнсіўнага лячэння. Сюды будуць паступаць самыя цяжкія пацыенты. Пасля аказання ім высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі яны будуць далечвацца ў іншых стацыянарах Мінска», — адзначыў старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый Піневіч.

У склад клінікі ўвойдзе радзільны дом, з якога і пачнецца будаўніцтва. Кіраваць работамі будуць французы. Клініку аснасцяць медыцынскім абсталяваннем айчыннай і замежнай вытворчасці. Завершыць яе будаўніцтва плануецца праз 5 гадоў.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».

ЗАПРАШАЮЦЬ «ПОЛАЦКІЯ ЛАЗНІ»

У моцныя халады жыхары Полацкага раёна рыхтуюцца пагрэцца на чэмпіянаце «Славутыя «Полацкія лазні».

Як абяцаюць арганізатары, усе ахвотныя змогуць выступіць на лазневым чэмпіянаце, які праводзіцца ў другі раз. Як паведамілі «Звяздзе» ў аддзеле ідэалагічнай работы Полацкага райвыканкама, чэмпіянат пройдзе 29 студзеня ў аграрнай сядзібе «Хутар ля крыніцы». Пасля лазні ўдзельнікі чэмпіянату будуць скакаць у палонку.

Вынікі спаборніцтваў плануюць вызначаць як у асабістым, так і камандным заліку. У кожнай камандзе будуць мужчына і жанчына.

Пераможцам абяцаюць прызы, магчыма і славуты «асабліва каштоўны венік». Добры настрой удзельнікам і гледачам створаць самадзейныя артысты. Усім прысутным на чэмпіянаце прапануюць смачны чай і стравы нацыянальнай беларускай кухні. У рамках свята будуць праводзіць розныя конкурсы, арганізуюць катанне на лыжах, прапануюць пабудаваць снежныя гарадкі і шмат іншых цікавых мерапрыемстваў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАКРЫЎДЖАНАЯ «БАМБІСТКА»

50-гадовая мінчанка з гарачкі «замініравала» будынак паштамта Гомеля

Пра тое, што нібыта ў горадзе на Сожы рыхтуецца выбух, жанчына паведаміла ў сталічную міліцыю ў снежні. Праваахоўнікі хутка ўстанавілі асобу «жартаўніцы» і высветлілі прычыны яе ўчынку.

Паводле звестак прэс-афіцэра Ленінскага РУУС Сяргея Козела, на працягу апошніх паўтара гадоў гэтая мінчанка здавала пакой студэнтцы з Гомеля. За гэты час яна паспела прывязацца да дзяўчыны, а таму вельмі перажывала, калі тая скончыла вучобу і з'ехала дадому працаваць. Жанчына некалькі разоў адпраўляла ў Гомель пісьмы і віншаванні. І чамусьці ёй аднойчы падалося, што яе пасланні не даходзяць да адрасата з-за дрэннай працы мясцовай пошты. Выпіўшы спіртнога, з гарачкі жанчына і набрала тэлефон «102»... У дачыненні да «бамбісткі» ўжо завершана расследаванне крымінальнай справы, санкцыі якой прадугледжваюць максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 5 гадоў.

Ігар ГРЫШЫН.

НА 81-ГАДОВУЮ БАБУЛЮ АБРУШЫЎСЯ ДАХ

Падчас начнога пажару ў прыватным жылым доме ў вёсцы Старынка Ушацкага раёна загінула 81-гадовая гаспадыня.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, бабуля жыла адна. Падчас пажару адбылося абрушэнне даху. Пры разборцы будаўнічых канструкцый выратавальнікі знайшлі цела жанчыны. Мяркуемая прычына ўзнікнення пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі печкі (шчыліна ў дымаходзе).

ПЯТЛЮ НА ШЫЮ КІРАЎНІКА ТАКСАПАРКА

Арыштавалі чатырох жыхароў Расіі, якія спрабавалі завалодаць машынай кіраўніка полацкай прыватнай кампаніі таксі.

Як паведаміў «Звяздзе» **начальнік упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр НАЙДЗЕНКА**, група расіян дзейнічала прадуманым спосабам падману. З пацярпелым пазнаёміліся быццам для таго, каб купіць «БМВ». Тры зладзеі селі разам з кіраўніком у аўто, і машына накіравалася на ўскраіну. Па дарозе накінулі на шыю кіраўніка пятлю.

Кіроўца іншай машыны, якая рухалася па гэтай жа дарозе, убачыўшы крымінал, адразу паведаміў у міліцыю. І ў выніку аператыўна былі прынятыя ўсе неабходныя меры для затрымання зладзеяў.

Дарэчы, як адзначыў генерал-маёр Найдзенка, у гэтай жа прыватнай таксаматорнай кампаніі працаваў таксіст, якога забілі некалькі гадоў таму. Справа тады атрымала вялікі рэзананс.

МАХЛЯР «КІНУЎ» НА АЎТО СЕМ ЧАЛАВЕК

У Шумілінскім раёне спрытны дзялок паабяцаў грамадзянам прыгнаць з Германіі аўто, узяў грошы і падмануў.

Цяпер расследаванне крымінальнай справы, заведзенай па фактах махлярства, звязанага з падманам пры продажы аўто, знаходзіцца пад асабістым кантролем начальніка Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама.

Як паведаміў «Звяздзе» кіраўнік міліцыі Віцебшчыны, **генерал-маёр Аляксандр НАЙДЗЕНКА**, падчас асабістага прыёму да яго звярнулася сем падманутых жыхароў Шумілінскага раёна. Яны і папрасілі пракантраляваць расследаванне гэтай крымінальнай справы. Махляр паабяцаў прыгнаць аўтамабілі з Германіі. Узяў грошы, ды «колаў» людзі так і не дачакаліся. Махляр зарабіў на падмане больш за 50 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

НОВЫЯ ПАМЕРЫ МІНІМАЛЬНЫХ СПАЖЫВЕЦКІХ БЮДЖЭТАЎ ЗАЦВЕРДЖАНЫ Ў БЕЛАРУСІ

У Беларусі ўстаноўлены памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў у сярэдніх цэнах снежня 2010 года для васьмі сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва. Гэтыя нарматывы будуць дзейнічаць з 1 лютага па 30 красавіка 2011 года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў аддзеле комплексных праблем развіцця сацыяльна-працоўнай сферы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек з 1 лютага гэтага года складзе Br480 тыс. 690 у разліку на месяц (з 1 лістапада 2010 года па 31 студзеня 2011-га — Br459 тыс. 620). Новы МСБ сям'і з чатырох чалавек павялічыўся на 4,6 працэнта. Гэта абумоўлена ростам цэн у чацвёртым квартале 2010 года на прадукты харчавання, прамысловыя тавары, а таксама ростам тарыфаў на паслугі, якія ўваходзяць у спажывецкія карзіны, растлумачылі ў міністэрстве. Нагадаем, сярэднедушавы МСБ сям'і з чатырох чалавек служыць асновай для вызначэння права грамадзян на атрыманне льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

Асноўныя артыкулы расходаў сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек у цэнах снежня 2010 года наступныя: прадукты харчавання — 54,6 працэнта, адзенне, бялізна, абутак — 19,1 працэнта, аплата жылля і камунальныя паслугі — 9,3 працэнта, бытавыя паслугі, транспарт, сувязь — 6 працэнтаў, прадметы санітарыі, гігіены, лекавыя сродкі — 1,9 працэнта.

Акрамя таго, зацверджаны сярэднедушавыя мінімальныя спажывецкія бюджэты маладой сям'і з трох чалавек — Br495 тыс. 230, працаздольнага насельніцтва — Br615 тыс. 120, пенсіянераў — Br495 тыс. 90, студэнтаў — Br466 тыс. 800, дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — Br381 тыс. 20, дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — Br463 тыс. 980, дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў — Br538 тыс. 850.

СКАРАЧАЕЦЦА КОЛЬКАСЦЬ ЦЯЖКІХ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

Наогул, паводле слоў Генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча, за апошнія гады ўзровень злачыннасці ў краіне стабільна зніжаецца. Прычым, падкрэсліў ён, каментуючы вынікі працы органаў пракуратуры ў мінулым годзе, зніжэнне злачыннасці адзначана ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі. Летась, напрыклад, агульная колькасць зарэгістраваных злачынстваў у параўнанні з 2009 годам зменшылася амаль на 7 працэнтаў — са 151 293 да 140 920.

Што датычыцца цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, то за апошнія тры гады намецілася ўстойлівая тэндэнцыя да іх скарачэння. У прыватнасці, летась зарэгістравана на 38,5 працэнта менш забойстваў у параўнанні з 2007 годам. Летась іх колькасць, калі параўноўваць з папярэднім годам, зменшылася амаль на 15 працэнтаў — з 571 да 486. Амаль напалову скарацілася колькасць рабаўніцтваў і разбояў (адпаведна 4170 і 565 у 2010 годзе і 7 747 і 1069 у 2007-м). Адметна і тое, што колькасць раскрытых злачынстваў, наадварот, расце: за тры гады намаганнямі следчых удалося павысіць агульны працэнт іх раскрыцця з 49 да амаль 60.

Закранаючы пытанне барацьбы з карупцыяй, Рыгор Васілевіч згадаў, што за 2010 год такіх злачынстваў было выяўлена на 8 працэнтаў больш, чым за папярэдні. Найбольшую ж долю тут складаюць хабарніцтва — 36,4 працэнта, службовыя падлогі — 28,8 і крадзяжы, учыненыя шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі (23,7 працэнта). Між іншым, калі гаворка ідзе пра службовыя падлогі, то праваахоўнікі часта фіксуюць факты падробкі даведак аб зарплаце ў бок яе завышэння для атрымання крэдыту ў банку. На думку генпракурора, апошняе сведчыць пра тое, што неабходныя адпаведныя змены ў заканадаўстве. Дарэчы, тое, што колькасць карупцыйных злачынстваў не змяншаецца, у пракуратуры ў шэрагу выпадкаў тлумачаць неналежнай якасцю працы па папярэджанні, выяўленні і спыненні карупцыі, якая праводзіцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі, а таксама невысокай эфектыўнасцю планавання і рэалізацыі мерапрыемстваў па барацьбе з карупцыяй.

Фармалізм, з якім некаторыя службовыя асобы падыходзяць да патрэб грамадзян, — яшчэ адна праблема, якой у пракуратуры, як і ў папярэдні час, будзе надавацца асаблівая ўвага. Паводле звестак Рыгора Васілевіча, у краіне ў апошні час прасочваецца тэндэнцыя росту зваротаў грамадзян у органы пракуратуры. Летась, напрыклад, іх колькасць дасягнула амаль 79 тысяч. Прычым кожная сёмая скарга, якая была разгледжана ў органах пракуратуры, прызнавалася абгрунтаванай. Праведзены аналіз зваротаў людзей сведчыць пра недахопы ў працы, перш за ўсё, мясцовых органаў улады, а таксама асобных службовых асоб па забеспячэнні правоў грамадзян на годны ўзровень жыцця, выкананні дзяржаўных сацыяльных стандартаў, належным разглядзе іх зваротаў. Менавіта таму ў пракуратуры разлічваюць дабіцца таго, каб мясцовыя ўлады падыходзілі да выканання сваіх абавязкаў больш адказна, належным чынам выконвалі свае абавязкі. У рамках рэалізацыі даручэнняў Прэзідэнта на падставе аналізу працы выканаўчых і распарадчых органаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Генпракурорам накіраванае пісьмо прэм'ер-міністру і старшыням аблвыканкамаў аб павышэнні эфектыўнасці работы са зваротамі.

Адказваючы на пытанне наконт таго, ці паступалі ў пракуратуру скаргі ад тых, каго абвінавачваюць у масавых беспарадках 19 снежня ў Мінску, пра немагчымасць іх сустрэч з адвакатамі, Рыгор Васілевіч зазначыў, што ад падазроных, якія знаходзяцца ў СІЗА КДБ, не было ні вусных, ні пісьмовых заяў. Ён паведаміў пра тое, што работнік пракуратуры 31 снежня мінулага года і 24 студзеня гэтага наведваў затрыманых. Андрэй Пусташыла, старшы пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб дзяржбяспецы Генпракуратуры, які праводзіў праверку, заявіў, што былі праведзеныя гутаркі з кожным з арыштаваных, якія ўтрымліваюцца ў следчым ізалятары КДБ. «Скаргаў, у тым ліку ад экс-кандыдатаў і іх давераных асоб, не паступала», — паведаміў ён. Генпракурор адзначыў, што ў выпадку ўзнікнення праблем сустрэч з адвакатамі яны павінны вырашацца, таму што закон прадугледжвае магчымасць канфідэнцыяльных сустрэч. Разам з тым, Рыгор Васілевіч падкрэсліў, што адвакаты ў сваю чаргу не павінны ствараць праблемы там, дзе іх няма.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

САЛОМА НА ЭКСПАРТ

Чэрыкаўскія паліўныя брыкеты, якія вырабляюцца з саломы, будуць прадавацца на экспарт. На ААТ «Чэрыкаўскі райаграпрамтэхснаб» усталявана і працуе польская лінія. Першая замова на 100 тон ужо паступіла з Расіі. За адну гадзіну перапрацоўваецца тона саломы, уся сыравіна — з уласных палеткаў прадпрыемства.

Ілона ІВАНОВА.

САВЕТ ВАМ ДЫ ЛЮБОЎ. ДА КУЛЬТУРЫ

Дзяржава вырашыла раіцца з грамадствам у культурных пытаннях

— Што рабіць з мастацтвам, якое радыё і тэлеканалы не асабліва любяць ставіць у эфір? Магчыма, для іх стварыць асобны канал «нефармат»?

— Якімі помнікамі кніжнай культуры Беларусь можа быць прадстаўлена ў свеце?

— Ці будзе асаблівая дзяржаўная праграма па ўшанаванні памятных дат і важных для Беларусі імёнаў?

— Ці будзе прафесійны тэатр у Полацку і іншых гарадах, дзе ёсць патэнцыйная тэатральная публіка?

— Як дзяржава можа падтрымаць беларускую мову — галоўную культурную адметнасць нашай краіны?...

Першае, устаноўчае, пасяджэнне Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва. Эмоцыі зашкальваюць. Яшчэ не паспелі агучыць усе пытанні, якія збіраецца разглядаць гэты орган, як ужо пайшлі прапановы. Актыўнае ў нас грамадства. Напэўна, таму, што любіць культуру. Нічога дзіўнага: яна тут фарміравалася і гартавалася стагоддзямі. Цяпер тое, што ёсць, важна не згубіць. Прытым не страціць будучую культуру, грунт якой закладваецца сённяшнімі рашэннямі.

Адказнасць — на пакаленні. Магчыма, таму дзяржава вырашыла параіцца ў гэтым з грамадствам. Упершыню кожны, хто мае свой погляд на айчынную культуру і канкрэтныя прапановы, можа быць пачуты. Нават калі яго імя няма ў спісе ўдзельнікаў савета, збіраюцца распрацаваць такі механізм яго злучэння з грамадскай супольнасцю, каб кожную слушную прапанову прыняць да ведама. Савет — гэта не статычны орган, гэта рада, дзверы ў якую адчынены для ўсіх тых, хто неабыякавы да сферы культуры.

Ініцыятыва фарміравання гэтага савета належала дзяржаўнаму органу кіравання, які адказвае за сферу культуры — Міністэрству культуры. Рашэнне прымалася Саветам Міністраў нашай краіны. У Рэспубліканскі грамадскі савет уваходзяць прадстаўнікі эліты беларускага мастацтва, народныя артысты СССР, народныя артысты Беларусі, заслужаныя дзеячы культуры і мастацтва, таксама прадстаўнікі творчай моладзі, прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў нашай краіны.

Павел ЛАТУШКА, міністр культуры, патлумачыў задачы савета:

— Для нас важна было мець зрэз грамадскай думкі ў галіне культуры. У перыяд развіцця нашай дзяржавы назапашаны вялікі досвед развіцця культуры. Зразумела, што культура застаецца жывым арганізмам. Нам здаецца, што наступае чарговы этап яе развіцця ў Беларусі. Таму вельмі важна пашыраць узаемаабмен думкамі, інфармацыяй паміж грамадскасцю, культурнай інтэлігенцыяй нашай краіны і дзяржавай, Саветам Міністраў у дадзеным выпадку, дзеля таго, каб атрымліваць сапраўды з першых крыніц інфармацыю аб тым, што варта рабіць далей, што варта змяніць, што варта ўдасканаліць. Мы плануем абмяркоўваць важныя праблемы нашай культуры, пачынаючы ад аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Гаварыць пра тое, што ўвогуле культура — гэта фактар, які праходзіць праз усё наша жыццё ад нараджэння і на працягу жыцця кожнай асобы. Мы лічым важным пагалядзець на справы творчай моладзі, падумаць, як яе падтрымаць. Асобная тэма — культура ў рэгіёнах нашай краіны. Бо алімпа прафесійнага мастацтва без рэгіянальнай культуры ўявіць сабе яе немагчыма. Вельмі важным з'яўляецца прасоўванне нашай культуры па-за межамі Беларусі. Развіццё кінамастацтва, тэатральнае мастацтва і іншыя віды — гэта ўсё пытанні вельмі важныя сёння. Гэта не значыць, што нічога не адбываецца ў гэтых сферах, што няма развіцця. Але абмен думкамі, інфармацыяй у сучасным зменлівым свеце вельмі важныя. Мне здаецца, вельмі важна зразумець, што сёння наступіў этап нашай культуры, калі мы павінны працаваць на свядомасць нашых грамадзян, каб рэальна, аб'ектыўна ўспрымаць сённяшнюю беларускую культуру як унутры краіны, так і спрыяць яе прасоўванню, ствараць станоўчы імідж нашай культуры за межамі Беларусі. Мяркую, што ў працэсе нашай працы з'явіцца больш новых ідэй і падыходаў. Неабходна сканцэнтраваць усе намаганні чалавечага і фінансавага рэсурсу на нашу працу па ўмацаванні станоўчага іміджу беларускай культуры.

Пасяджэнні савета мяркуюць праводзіць 2-3 разы на год. Адначасова будзе працаваць пастаянная рабочая група савета, спецыяльныя рабочыя групы па секцыях, па кірунках мастацтва. Калі будзе патрэба, будуць створаны часовыя рабочыя групы, якія больш дэталёва абмяркуюць важныя пытанні і будуць уносіць іх ужо падрыхтаванымі на разгляд Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва.

Дзеля чаго? Каб само грамадства магло ўплываць на фарміраванне асноўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры, удзельнічаць у выпрацоўцы мер па яе рэалізацыі. Каб культурная ініцыятыва з месцаў не патанула ў штодзённых клопатах і мерапрыемствах. Каб кожны творца ці зацікаўлены глядач і слухач мог удзельнічаць у падрыхтоўцы прававых актаў у галіне культуры. Таму ў склад савета ўвайшлі кіраўнікі ўсіх грамадскіх арганізацый, якія існуюць у сферы культуры — усяго 68 прадстаўнікоў нашай культурнай эліты.

Міністр культуры Беларусі Павел Латушка прывітаў удзельнікаў Савета словамі Максіма Багдановіча: «... Каб стаць бліжэй душы роднага народа, лепей наталіць яе духоўную смагу і сапраўды ўзяцца за вялікую працу — развіццё беларускай роднай культуры».

Нездарма для першага пасяджэння абралі Мірскі замак, які адкрыўся пасля рэстаўрацыі.

— Стварэнне Мірскага замка ў мінулым сведчыць аб узроўні развіцця нашай нацыі пяць стагоддзяў таму. Аднаўленне яго ў XXI стагоддзі — добры прыклад развіцця самасвядомасці беларускай нацыі сёння, — адзначыў Павел Латушка. — Сёння культура з'яўляецца дзейсным інструментам у духоўным выхаванні грамадзян нашай краіны. Няма сумненняў, што беларуская культура — самабытная, мае багатую культурную спадчыну, у нас шмат таленавітых мастакоў, музыкантаў, акцёраў, рэжысёраў... Беларуская культура з'яўляецца часткай еўрапейскай культурнай прасторы, яна ўносіць важкі ўклад у сусветную культуру. Адметнасць беларускай культуры ў яе еўрапейскасці. А еўрапейскасць падкрэслівае яе беларускасць. Мы ўзбагаціліся культурнымі здабыткамі нашых суседзяў з усходу і захаду, стварылі свой уласны падмурак. Мінулае дае падмурак сучаснаму развіццю. Нам не трэба ствараць легенду ўласнай гісторыі. Дастаткова падняць рэальна існуючы культурна-гістарычны пласт і на гэтай аснове працягваць будаўніцтва сучаснай беларускай культуры. Наша культура шматпланавая, неадназначная і цікавая.

Міністр агучыў асноўныя планы, якія пазначаны ў асобнай праграме «Культура Беларусі на 2011-2015 гг.» Яна была прынятая ўпершыню на ўрадавым узроўні. Мэта: павышэнне сацыяльнай і эканамічнай эфектыўнасці культуры.

Планаваць можна шмат, але любыя планы выконваюцца канкрэтнымі людзьмі. Ва ўстановах культуры сёння працуе больш за 63 тысячы спецыялістаў. У сістэме Міністэрства культуры налічваецца 9000 устаноў культуры, з іх рэгіянальных — 8900. Кожны мае сваё ўяўленне пра развіццё культуры і погляд, на што варта звярнуць увагу.

Барыс СВЯТЛОЎ, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

— Як выхаваць асобу, якая б культурна ставілася да культуры? Кожны час фармулюе гэтае пытанне па-новаму. У нашых сучасных варунках яно можа гучаць ужо не «З кім вы, майстры культуры?», а такім чынам: «Ці з майстрамі культуры вы, выдатнікі адукацыі?» Да гэтых разважанняў мяне падштурхоўвае стан спраў з эстэтычным выхаваннем і мастацкай адукацыяй у апошні час. Да пачатку 90-х гадоў Беларусь была лідарам у мастацка-эстэтычным выхаванні ў былым СССР. СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.01.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	3 012,00	1 чэшская крона	170,42
▼ 1 еўра	4 113,19	1 польскі злоты	1 060,26
1 латвійскі лат	5 838,34	▲ 1 расійскі рубель	101,50
1 літоўскі літ	1 193,15	1 украінская грыўня	379,51

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,6738
10 UAH	37,3820
1000 BYR	9,8519
EUR	40,6205

Дырэктар фонду «Гомельаблмаёмасць» Кацярына ЗЕНКЕВІЧ:

«АКЦЫЯНЕРНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ СТВАРАЮЦЦА НЕ ДЗЕЛЯ ЗМЕНЫ ШЫЛЬДЫ»

НА аўкцыёнах па продажы аб'ектаў дзяржаўнай (рэспубліканскай і камунальнай) уласнасці ў Гомельскай вобласці летась было прададзена 348 аб'ектаў, што на 118 больш, чым у 2009 годзе. Кошт прададзеных аб'ектаў склаў Br10, 8 млрд (гэта ў 2,3 раза больш, чым у 2009 годзе). Дырэктар Гомельскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці Кацярына Зенкевіч расказала, што ўсяго ў мінулым годзе арганізацыяй было праведзена 123 аўкцыёны, на якіх было выстаўлена на продаж больш за 700 збудаванняў.

— Найбольшым попытам на аўкцыёнах карысталіся аб'екты нерухомасці, якія прадаюцца за адну базавую велічыню. 200 з 235, якія выстаўляліся на продаж, былі рэалізаваны. Гэта на 114 адзінак больш, чым у 2009 годзе. Найбольш актыўна ў гэтую працу ўключыліся Хойніцкі, Буда-Кашалёўскі і Рэчыцкі райвыканкамы. У мінулым годзе некалькі актывізавалася праца па перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне пад рэалізацыю канкрэтных інвестпраектаў і стварэнне дадатковых рабочых месцаў. Калі за два папярэднія гады (2008-2009) было перададзена 37 аб'ектаў, якія не выкарыстоўваліся, то ў 2010 годзе — 51. Напрыклад, чатыры такія аб'екты КСУП «Чалюшчавічы» Петрыкаўскага раёна былі перададзены ў сярэдзіне мінулага года ў бязвыплатнае карыстанне СТАА «Біясол». У развіццё прадпрыемства ўжо ўкладзена 1,5 млрд рублёў, створана 5 працоўных месцаў. У бліжэйшыя дні гэтае прадпрыемства па вытворчасці паліўных гранул пачне працу. Тут будзе створана яшчэ 15 працоўных месцаў.

— Раскажыце, калі ласка, як на Гомельшчыне выкарыстоўваецца дзяржаўная маёмасць?

— Агульная плошча будынкаў і збудаванняў камунальнай уласнасці ў Гомельскай вобласці складае больш за 15 млн кв. метраў. З яе больш чым 91 % выкарыстоўваецца ўладальнікамі маёмасці самастойна, 5 % здаецца ў арэнду, 3,8 % — не выкарыстоўваецца. І апошняя лічба — зона нашай асаблівай адказнасці. Летась у Гомельскай вобласці ўключаны ў гаспадарчы абарот 743 аб'екты, якія не выкарыстоўваюцца, 464 — знесены, 174 — прададзены. Па колькасці ўцягнутых у гаспадарчы абарот такіх аб'ектаў у нас лепшы паказчык у рэспубліцы. Гомельская вобласць знаходзіцца ў лідарах і па ўключэнні ў гаспадарчы абарот аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, рэспубліканскай уласнасці. Аналізуючы ўцягванне ў гаспадарчы абарот аб'ектаў камунальнай уласнасці за апошнія 3 гады, хачу адзначыць станоўчую дынаміку павелічэння ўдзельнай вагі ў рэальным уцягванні на 9 %, памяншэння ўдзельнай вагі аб'ектаў, якія зносяцца, на 14 працэнтных пунктаў. СТАР. 7